Установа адукацыі
“БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ АКАДЭМІЯ МАСТАЦТВАЎ”

# МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА
# (ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА)

прaграма ўступнага экзамена па дысцыпіне “Творчасць” на спецыяльнасць
1-21 04 02-03 “Мастацтвазнаўства (выяўленчае мастацтва)”

Мінск 2021

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Уступны экзамен па творчасці на спецыяльнасць 1-21 04 02-03 “Мастацтвазнаўства (выяўленчае мастацтва)” праводзіцца з мэтай конкурснага адбору абітурыентаў. Падчас экзамену вызначаецца схільнасць абітурыентаў да прафесіі мастацкага крытыка і даследчыка гісторыі мастацтва, шырыня іх кругагляду і глыбіня ведаў у галіне гісторыі і тэорыі мастацтва. На экзамене таксама правяраюцца аналітычныя здольнасці абітурыентаў, арыгінальнасць мыслення, уменне лагічна выказваць думкі ў вуснай і пісьмовай форме, індывідуальны мастацкі густ і іншыя якасці, неабходныя ў мастацтвазнаўчай прафесіі.

Экзамен праводзіцца ў тры этапы:

1. Рэцэнзія на твор станковага жывапісу (пісьмова).
2. Гісторыя замежнага і беларускага выяўленчага мастацтва (вусна).
3. Субяседванне па пытаннях сучаснага мастацтва, мастацтвазнаўства і мастацкай крытыкі (вусна).

Адпаведна з такім парадкам правядзення экзамену, праграма складаецца з трох раздзелаў і акрэслівае неабходны аб’ём ведаў, уяўленняў, здольнасцей і навыкаў, якія абітурыент павінен праявіць на ўсіх трох этапах здачы ўступнага экзамену.

Дадзеная праграма складзена з улікам практыкі выкладання гісторыі і тэорыі мастацтва ў дзіцячых мастацкіх школах і сярэдніх спецыяльных навучальных установах мастацтваў Рэспублікі Беларусь.

Праграма можа быць выкарыстана абітурыентамі пры падрыхтоўцы да ўступных экзаменаў і падчас іх правядзення.

## 1. РЭЦЭНЗІЯ НА ТВОР СТАНКОВАГА ЖЫВАПІСУ (ПІСЬМОВА)

На першым этапе экзамена абіурыент павінен выбраць з прапанаваных варыянтаў (выстаўленых у экзаменацыйнай аудыторыі) адзін твор жывапісу і на працягу 4 гадзін напісаць рэцэнзію ў аб’ёме 4 – 6 рукапісных старонак.

Рэцэнзія мае адвольную структуру, аднак неабходна, каб у тэксце ў лагічнай паслядоўнасці былі раскрыты наступныя аспекты мастацкага твора:

1. Сюжэтная аснова, вобразны і агульнакультурны сэнс твора.
2. Асаблівасці мастацкай формы твора (кампазіцыйны строй, каларыстычнае і пластычнае рашэнне) з улікам індывідуальнага стылю мастака і спецыфікі яго тэхніка-тэхналагічных прыёмаў.

Усе мастацкія кампаненты карціны павінны быць прааналізаваны ў шчыльнай узаемасувязі як асобныя часткі цэласнага мастацкага вобраза і зыходзячы з таго, як гэтыя кампаненты ў сукупнасці падначалены раскрыццю ідэі твора.

**Пры напісанні рэцэнзіі неабходна:**

сцісла апісаць твор;

вызначыць жанравую прыналежнасць;

вызначыць тэму карціны;

выявіць ідэю (задуму) мастака і прасачыць спецыфіку ўвасаблення гэтай задумы ў карціне: як аўтар інтэрпрэтаваў тэму;

прааналізаваць асаблівасці мастацкай формы (кампазіцыі, малюнка, каларыту і інш.);

звярнуць увагу на асаблівасці аўтарскага стылю і манеры;

раскрыць, якімі сродкамі дасягаецца метафарычнасць, вобразнасць пластычнага вырашэння;

на якіх акцэнтах (дэталях, позах і іншых візуальных характарыстыках персанажаў) базіруецца ўвасабленне аўтарскай ідэі;

якія прыёмы скарыстаў мастак для таго, каб засяродзіць увагу гледача на самых важных аспектах карціны;

пры неабходнасці выявіць недахопы твора;

паспрабаваць вызначыць месца дадзенага твора ў сучасным беларускім мастацтве, сярод іншых спроб мастацкага асэнсавання дадзенай праблематыкі (параўнайце карціну з блізкімі па тэме творамі іншых мастакоў);

зрабіць падагульненне: у чым, у выніку, заключаецца эстэтычная і этычная канцэпцыя твора.

Абітурыент павінен прадэманстраваць уменне апісаць твор мастацтва так, каб яго можна было ўявіць сабе, чытаючы тэкст. Важна таксама правільна зразумець памкненні мастака, праявіць мастацкі густ і самастойнасць мыслення.

Акрамя гэтага, пры ацэнцы рэцэнзіі ўлічваюцца ўменне выкладаць думкі паслядоўна, лагічна і валоданне навыкамі пісьмовай мовы (вобразнасць моўных сродкаў, прыгажосць і яснасць стылю).

# 2. ГІСТОРЫЯ ЗАМЕЖНАГА І БЕЛАРУСКАГА ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА (ВУСНА).

## 2.1. МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ

### Мастацтва старажытных зямель Беларусі XI–XIII стст.

**Архітэктура.** Сабор Св. Сафіі ў Полацку (1044). Спаса-Ефрасінеўская царква ў Полацку (1152–1161). Барысаглебская (Каложская) царква ў Гродне (XII ст.). Вежа ў Камянцы (XIII ст.). **Жывапіс.** Фрэскавыя роспісы храмаў Полацка. **Мастацкае афармленне рукапісных кніг.** Тураўскае Евангелле (XI ст.), Аршанскае Евангелле (XII–пачатак XIII ст.). **Дробная пластыка XII–XIII стст.** Каменны абразок з Полацку "Канстанцін і Алена", абразок з выявай Божай Маці і Св. Пятра з Мінскага замчышча, шахматныя фігуркі.

**Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.** Ювелірныя вырабы. Крыж Ефрасінні Полацкай працы майстра Лазара Богшы (1161 г.).

### Мастацтва Беларусі XIV–XVI стст.

**Абарончая архітэктура.** Замкі XIV ст. у Лідзе і Крэва, замак у Навагрудку (XIII–XVI стст.), Мірскі замак (XVI–XVII стст.) і іх месца ў культурнай спадчыне Беларусі. Храмы-крэпасці: царква Архангела Міхаіла ў Сынковічах (пачатак XVI ст.), Царква Раства Багародзіцы ў в. Мураванка (1516–1542), Дабравешчанская царква ў Супраслі (XVI ст.). Першая пабудова ў стылі барока на тэрыторыі Беларусі: касцёл Божага Цела (езуітаў) у Нясвіжы (1583–1593).

**Станковы жывапіс.** "Адзігітрыя Смаленская" з в. Дубянец (XVI ст.), "Св. Параскева"(XVI ст.); "Пакланенне вешчуноў" з в. Дрысьвяты (пачатак XVI ст.). Свецкія партрэты: партрэт Юрыя Радзівіла (2-ая пал. XVI ст.), Партрэт князя Міхаіла Барысавіча (канец XVI–пачатак XVII ст.), Партрэт Кацярыны Слуцкай (1580-я), партрэт Ежы Радзівіла (1590).

**Скульптура.** Дробная пластыка (нагрудныя крыжы і абразкі з Турава, Пінска і інш.) Скульптурныя творы, прызначаныя для каталіцкіх храмаў: "Св. Рыгор Багаслоў" (пач. XVI ст.). **Мемарыяльная скульптура і надмагіллі**: Надмагілле Паўла Сапегі з касцёла Іаана Хрысціцеля ў в. Гальшаны (канец XVI–пачатак XVII ст.).

**Мастацтва рукапіснай і друкаванай кнігі.** Мсціжскае Евангелле (XIV ст.), Лаўрышаўскае Евангелле (XIV ст.), Радзівілаўскі (Кенігсбергскі) летапіс (1485–1495). Першадрукар Францыск Скарына (1490 (?)–1551 (?)). Яго роля ў развіцці ўсходнееўрапейскага кнігадрукавання, пражскія і віленскія выданні Ф. Скарыны.

**Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.** Кераміка (кафля з выявамі геральдычных матываў, фігур людзей і жывёл). Вырабы з шкла (формы посуду і прыёмы яго дэкарыравання).

## Мастацтва Беларусі XVII ст.

**Архітэктура.** Барока – асноўны мастацкі стыль у архітэктуры XVII – XVIII ст., касцёл адшукання Св. Крыжа (бэрнардынаў) у Гродна (1602–1618), царква Св. Пятра і Паўла ў Мінску (1620-я), касцёл Звеставання (брыгітак) у Гродна (1642 – 1651), касцёл Архангела Міхаіла (аўгусцінцаў) у Міхалішках (1653), касцёл Св. Язэпа ў Менску (XVII–XVII стст.), Мікалаеўская царква ў Магілёве (1669), касцёл Францішка Ксаверыя ў Гродна (1678–1700).

**Жывапіс.** Пранікненне жанравых элементаў і апавядальнасці ў іканапіс XVII ст. Абразы "Нараджэнне Марыі" (з надпісам "Пётр Яўсеевіч з Голынца") (1649) і інш. Развіццё "сармацкага" партрэта ў XVII ст.: Партрэт Грызельды Сапегі (1630-я), партрэт Кшыштафа Весялоўскага (1636), партрэт Я. Радзівіла (Д. Шульц, 1650-я), партрэт Кацярыны і Марыі Радзівіл (І. Шрэтэр, 1646).

**Графіка.** Далейшае развіццё беларускага кнігадрукавання і кніжнай гравюры. Роля праваслаўных брацтваў (Віленскае, Куцеінскае, Траецкае) у захаванні кнігадрукавання на роднай мове. Новыя тэхнікі і жанры графікі XVII ст. Дзейнасць мастака і картографа Т. Макоўскага (1562/1575 – каля. 1630): ілюстрацыі да кнігі "Гіпіка" (1620), карта Вялікага княства Літоўскага. Творчасць А. Тарасевіча (?–каля 1730): партрэты; гравюры каляндарнага цыклу з кнігі "Малітвы і службы Маці Божай (Разарыум)" (1672).

**Скульптура.** Рысы Рэнесансу і барока ў творах мемарыяльнай пластыкі. Надмагіллі М.К. Радзівіла ў касцёле Божага Цела ў Нясвіжы (пасля 1616). Скульптура ў інтэр'еры храмаў: алтар капліцы Св. Барбары ў касцёле бернардынцаў у Будславе (XVII ст.).

**Дэкаратыўна–прыкладное мастацтва.** Росквіт мастацкай апрацоўкі металу: абклады абразоў і кніг, літургічны посуд, крыжы. Разьба па дрэве – неад'емная частка ўпрыгожвання храмаў і свецкіх пабудоў. Аб'ёмна-ажурная разьба ў інтэр'ерах Мікалаеўскай царквы ў Магілёве (XVII ст.). Архітэктурна-дэкаратыўная кераміка (паліхромныя кафлі, разнастайнасць іх формаў, ужыванне ў інтэр'ерах і на фасадах будынкаў). Дзейнасць беларускіх майстроў у Маскоўскай дзяржаве (2-ая пал. XVII ст.).

## Мастацтва Беларусі XVIII ст.

**Архітэктура.** Помнікі сталага, позняга і "віленскага барока": Фарны касцёл у Навагрудку (1714–1723), касцёл Ушэсця Маці Божай у Будславе (1767–1783), царква Святой Сафіі Полацку (І. Глаўбіц, сярэдзіна XVIII ст.). Палацава–паркавы ансамбль Радзівілаў у Нясвіжы (XVI–XVIII стст.). Палацавыя комплексы: Каралеўскі палац у Гродне (XVIII ст.), Палац Сапегаў у Ружанах (XVIII ст.).

**Жывапіс.** Манументальны жывапіс: роспісы касцёла Св. Станіслава ў Магілёве (1765–1767), касцёла Божага Цела ў Нясвіжы (Ф. К. Гескі, 1751–1753). Партрэтны жывапіс XVIII ст.: Партрэт Т.Р. Флемінг з роду Радзівілаў (Луі дэ Сільвестр Малодшы, 1720-я), партрэт М.К. Агінскага (Г. Р. Лішэўская, 1753), партрэт С.А. Панятоўскага (Ю. К. Гескі, 1783) і інш.

**Графіка.** Творчасць М. Вашчанкі (? –1708): афармленне кніг "Манархія турэцкая" (1678). Развіццё гравіраванага партрэту: альбом "Выява роду князёў Радзівілаў" (Г. Ляйбовіч, Ф. К. Гескі, XVIII ст.).

**Скульптура.** Алтарная пластыка і скульптурны дэкор храмаў: францысканскі касцёл у Пінску (1720–1730-я гг.), Касцёл Францыска Ксаверыя ў Гродне (1737–1760). Народная драўляная скульптура XVIII ст. (інтэрпрэтацыя стылю барока).

**Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.** Мануфактуры па вытворчасці мастацкіх вырабаў. Урэцка-Налібоцкае шкло – прадукцыя мануфактур Радзівілаў, разнастайнасць формаў і дэкаратыўных прыёмаў. Фаянсавыя вырабы Сверженьскай і Целеханскай мануфактур. Ткацкія мануфактуры ў Карэлічах, Слоніме, Слуцку. Высокія мастацкія якасці слуцкіх паясоў.

## Мастацтва Беларусі першай паловы XIX ст.

**Архітэктура.** Распрацоўка рэгулярных планаў гарадоў Беларусі, заснаваная на прынцыпах класіцызму (Магілёў, Віцебск, Гомель і інш.) Культавая архітэктура: сабор св. Пятра і Паўла ў Гомелі (1809–1824). Класіцызм у палацава-сядзібнай архітэктуры. Палац Румянцавых (Паскевічаў) у Гомелі (Я. М. Аляксееў і М. І. Бланк, 1777–1796, Дж. Кларк, 1800–1805, А. Ідзікоўскі, 1837–1851) і інш. Гістарызм у архітэктуры: палац Пуслоўскіх у Косава (Ф. Яшчальд, 1838).

**Жывапіс.** Ф. Смуглевіч (1745–1807) – мастак і педагог; яго роля ў фармаванні і развіцці мастацкай школы Віленскага ўніверсітэта. Гістарычная тэма ў творах Ф. Смуглевіча: "Прысяга Тадэвуша Касцюшкі на Кракаўскім рынку", "Сяляне ў нацыянальных касцюмах". Творчасць Ю. Аляшкевіча (1777–1830): "Партрэт А. Чартарыйскага" (1810). Гістарычная жывапіс Я. Дамеля (1780–1840): "Адступленне французаў праз Вільню ў 1812 г." (1820-я), "Вызваленне Т. Касцюшкі з зняволення" (1830-я). В.М. Ваньковіч (1799–1842) – найбуйнейшы беларускі мастак І-ай паловы XIX ст. "Адам Міцкевіч на скале Аюдаг" (1828), "Партрэт жонкі з дзецьмі" (1834). І. Хруцкі (1810–1885) – заснавальнік жанру нацюрморта ў беларускім жывапісе. "Кветкі і садавіна" (1837), "Нацюрморт са свечкай" (1840) і інш Партрэты Хруцкага: "Партрэт невядомай з кветкамі і садавінай" (1838), "Партрэт хлопчыка ў саламяным капелюшы" (канец 1830-х).

**Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.** Уплыў класіцызму на формы вырабаў мастацкага шкла з Урэцкай і Налібоцкай мануфактур ў І-ой палове XIX ст. Народнае мастацтва саломапляцення ў афармленні інтэр'ераў храмаў.

## Мастацтва Беларусі другой паловы XIX ст.

**Архітэктура.** Хуткі рост гарадоў і змены ў іх прасторава-планіровачнай структуры. З'яўленне новых тыпаў пабудоў (вакзалы, банкі, прамысловыя будынкі, шматпавярховыя "прыбытковыя" дома). Эклектыка і гістарычнае стылізатарства ў архітэктуры: "рэтраспектыўна-рускі стыль": капліца-пахавальня Паскевічаў у Гомелі (арх. Я. Чарвінскі, 1870–1889) і інш.; неаготыкі: капліца ў в. Сар'я (1852–1857) і інш.; нэарэнесанс: сядзібны дом ў Пружанах (2-я пал. XIX ст.). Стыль "мадэрн": сядзібны дом ў в. Чырвоны Бераг (1890–1893).

**Жывапіс.** Гістарычны жанр у творчасці К. Альхімовіча (1840–1916): адлюстраванне падзей 1863 г. у карцінах "Пахаванне на Урале" (1873), "На этапе" (1894). Пейзажы А. Гараўскага (1833–1900): "Вечар у Мінскай губерні" (1870–е) і інш. Творчасць М. Сілівановіча (1834–1919): аўтапартрэт (1880–я), "Салдат з хлопчыкам" (1866).

**Графіка.** Ідэі свабоды і незалежнасці ў гістарычнай графіцы М.Э. Андрыёлі (1836–1893): "Вылазка паўстанцаў" (1860–е), "Смерць Кейстута" (1880–е), ілюстрацыі да паэмы А. Міцкевіча "Пан Тадэвуш" (1882). Архітэктурны краявід: творчасць Н. Орды (1807–1883).

**Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.** Заняпад мануфактурнай вытворчасці, росквіт народнага мастацтва. Разьба па дрэве ў народным дойлідстве. Роспіс па дрэве (куфры, вазкі і інш.) Мастацкае ткацтва і вышыўка: дэкаратыўныя посцілкі, дываны, ручнікі, адзенне. Цэнтры традыцыйных ганчарных промыслаў: Гарадная, Івянец, Пружаны і інш.) Капыская, івянецкая кафля.

## РАЗДЗЕЛ 2.2. МАСТАЦТВА ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ І РАСІІ

### <u>Мастацтва Заходняй Еўропы эпохі Адраджэння (XV–XVI стст.).</u>

**Мастацтва Італіі.** Гуманізм як ідэйная аснова мастацтва Адраджэння. Антычныя традыцыі і рэнесанснае светаўспрыняцце ў архітэктуры: творчасць Ф. Брунелескі (1377–1446): купал сабора Санта Марыя дэль Ф'ёрэ (1420–1446) і Выхаваўчы дом (1419–1444) у Фларэнцыі. Творчасць Д. Брамантэ: (1444–1514): "Тэмп'ета" ў Рыме (1502). Скульптура: творчасць Данатэла (1386–1466) – "Давід" (1430–1440-я гг.), конны манумент кандацьера Гаттамелаты ў Падуі (1447–1453).

**Жывапіс Ранняга Адраджэння ў Італіі:** жыццёвая пераканаўчасць вобразаў, распрацоўка прыёмаў лінейнай перспектывы. Творчасць Мазачча (1401–1428/29): фрэскі "Выгнанне з рая", сцэны з жыцця апостала Пятра (усе – 1420-я). Творчасць П'ера дэлла Франчэска (каля 1410/1420–1492): "Хрышчэнне Хрыста" (1445), партрэт герцага Урбінскага (1465). Творчасць С. Батычэллі (1444–1510): "Вясна" (1470-я), "Нараджэнне Венеры" (каля 1485) і інш.

**Вялікія майстры Высокага Адраджэння (пачатак XVI ст.).**

**Мікеланджэла Буонароці** (1475–1564): скульптурныя творы – "Давід" (1504), алегарычныя фігуры ў капэле Медычы ў Фларэнцыі – "Ранак", "Вечар", "Дзень" і "Ноч" (1520–1534). Шэдэўр манументальнага жывапісу Мікеланджэла – фрэскі Сіксцінскай капэлы ў Рыме (1508–1512).

**Леанарда да Вінчы** (1452–1519) – мастак і вучоны-гуманіст. Роспіс "Тайная вячэра" (1495–1498). Партрэтная творчасць Леанарда: "Дама з гарнастаем" (1490-я гг.), "Джаконда" (1503—1505) і інш.

**Рафаэль Санці** (1483–1520). Вобраз мадонны ў творчасці Рафаэля: "Мадонна ў зяляніне" (1505), "Сікстынская мадонна" (1515–1519). Роспісы Рафаэля: "Афінская школа" (1511–1514).

**Мастацтва Нідэрландаў.** Выдатны твор Нідэрландскага Адраджэння – Генцкі алтар (1426–1432). Творчасць Яна ван Эйка (каля 1390–1441): "Мадонна канцлера Ролена" (1435/36), "Партрэт Джавані Арнальфіні і яго жонкі" (1434). Фантастычныя і філасофскія творы Іераніма Босха (каля 1450–1516): "Фокуснік", "Карабель дурняў", "Сады суцяшэнняў" (усе – канец XV ст.). Творчасць Пітэра Брэйгеля Старэйшага (каля 1526–1569): "Нідэрландскія прыказкі" (1559), "Паляўнічыя на снезе" (1565), "Сляпыя" (1568).

**Мастацтва Германіі.** Рэфармацыйны рух і яго ўплыў на нямецкае мастацтва. Росквіт гравюры. Творчасць Альбрэхта Дзюрэра (1471–1528): аўтапартрэты 1498 і 1500 гадоў, іншыя жывапісныя творы – партрэт маладога чалавека (1521), "Чатыры апосталы" (1526). Гравюры Дзюрэра: "Чатыры коннікі" (ілюстрацыя да "Апакаліпсіса", 1498), "Коннік, смерць і д'ябал" (1513), "Меланхолія" (1514). Творчасць Лукаса Кранаха Старэйшага (1472–1553): "Мадонна пад яблынай" (1510-я), "Тры грацыі" (1535).

## <u>Мастацтва Заходняй Еўропы XVII ст.</u>

**Мастацтва Італіі.** Зараджэнне стылю барока ў італьянскім мастацтве. Асаблівасці стылю: дынаміка кампазіцыі, кантрасты маштабаў і рытмаў, крывалінейнасць абрысаў. Царква Іль Джэзу ў Рыме (1568–1584, арх. Віньёла і Дж. дэлла Порта). Творчасць Дж. Берніні (1598–1680) – плошча Св. Пятра ў Рыме (1657–1663). Скульптура Берніні: "Апалон і Дафна" (1622–1625), "Давід" (1623), "Экстаз Св. Тэрэзы" (1647–1652). Творчасць Караваджа: "Юнак з лютняй" (каля 1595), "Пакліканне апостала Матфея" (1598–1601), "Смерць Дзевы Марыі" (1605–1606) і інш.

**Мастацтва Фландрыі.** П.П. Рубенс (1577–1640) – лідэр фламандскай школы жывапісу. Сюжэтныя карціны Рубенса: "Усталяванне крыжа" (каля 1610–1611), "Персей і Андрамеда" (1620–1621), партрэты – аўтапартрэт з Ізабэлай Брандт (1609–1610), "Партрэт камерысткі" (каля 1625). Партрэтны жанр у творчасці А. Ван Дэйка (1599–1641): аўтапартрэт (каля 1613), партрэт Карла V (каля 1635). Творчасць Я. Йорданса (1593–1678): "Бабовы кароль" (1648). Майстар нацюрморту Ф. Снэйдэрс (1579–1657).

**Мастацтва Галандыі.** Разнастайнасць жанраў станковага жывапісу. Творчасць Ф. Хальса (каля 1580–1666): групавы партрэт афіцэраў роты

Св. Георгія (1616), "Цыганка" (1628–1630). Бытавы жанр галандскага жывапісу: Я. Стэн (1626/27–1679) – "Гулякі", Я. Вермер Дэльфцкі (1632–1675) – "Служанка са збанам малака" (1657–1660), "Дзяўчына з пісьмом" (1650-я гг.).

**Рэмбрандт (1606–1669) – выдатны жывапісец і графік XVII ст.** Псіхалагізм і гуманістычная накіраванасць творчасці Рэмбрандта: "Даная" (1636), "Начны дазор" (1642), "Святое Сямейства" (1645), "Вяртанне блуднага сына" (1660-я гг.), аўтапартрэты Рэмбрандта, яго афорты.

**Мастацтва Іспаніі.** Рэалістычная накіраванасць іспанскага жывапісу першай паловы XVII ст. Творчасць Х. Рыберы (1591–1652): "Святая Інэса" (1641), "Храманожка" (1642). Творчасць Д. Веласкеса (1599–1660): партрэты членаў іспанскай каралеўскай сям'і – караля Філіпа IV (1657), інфанты Маргарыты (каля 1660) і інш. Сюжэтныя карціны Веласкеса: "Здача Брэды" (1634–1635), "Меніны" (1656), "Папрадухі" (1657).

**Мастацтва Францыі.** Росквіт палацавага будаўніцтва. Архітэктурны ансамбль каралеўскай рэзідэнцыі ў Версалі (1668–1689) – асаблівасці архітэктуры, інтэр'еру, садова-паркавага мастацтва. Станаўленне французскай нацыянальнай школы жывапісу. Творчасць Н. Пусэна (1594–1665): "Царства Флоры" (1620–1630), "Аркадскія пастухі" (1632–1635) і інш.

## Мастацтва Заходняй Еўропы і Расіі XVIII ст.

**Мастацтва Францыі.** Жывапіс А. Ватто (1687–1721): "Адплыцце на востраў Кіферу" (1717), "Жыль" (1720). **Стыль ракако** ў архітэктуры (атэль Субіз у Парыжы, арх. П. Дэламер, 1705–1709), жывапісе (творчасць Ф. Бушэ, 1703–1770) дэкаратыўным мастацтве – інтэр'ерах, мэблі, фарфоры. Ідэі філасофіі Асветніцтва ў творчасці Ж.–Б. Шардэна (1699–1779): "Кухарка" (1738), "Малітва перад абедам" (1744). Нацюрморты Шардэна. Класіцызм у французскім жывапісе другой паловы XVIII–пачатку XIX ст. – творчасць Ж.Л. Давіда (1748–1825): "Клятва Гарацыяў" (1784), "Смерць Марата" (1793), "Напалеон на перавале Сен-Бернар" (1801), партрэты Давіда (партрэт мадам Рэкам'е, 1800).

**Мастацтва Англіі.** Асветніцкі рэалізм у англійскім жывапісе. Творчасць У. Хогарта (1697–1764): сатырычныя серыі карцін "Кар'ера марнатраўца" (1735), "Модны шлюб" (1743). Партрэты Дж. Рэйнальдса (1723–1792): партрэт камадора Кеппела (1753–1754), партрэт лорда Хітфілда (1787–1788). Творчасць Т. Гейнсбара (1727–1788): "Блакітны хлопчык" (каля 1770), партрэт актрысы С. Сіданс (каля 1783) і інш.

**Мастацтва Іспаніі: творчасць Ф. Гойі (1746–1828).** Аналіз духоўнага свету чалавека ў партрэтах Гойі: "Сям'я караля Карла IV" (1800). Адлюстраванне гераічнай барацьбы іспанскага народа: "Расстрэл паўстанцаў у ноч на 3 мая 1808 года" (1814). Афорты Гойі: серыя "Капрычас" (1793–1797).

**Мастацтва Расіі першай паловы XVIII ст.** Рэформы Пятра I у пачатку XVIII ст. і іх уплыў на развіццё мастацтваў. Архітэктура новай расійскай сталіцы – Санкт-Пецярбурга (заснаваны ў 1703): Петрапаўлаўскі сабор (арх.

Д. Трэзіні, 1712–1733), Кунсткамера (завяршэнне будаўніцтва – арх. М.Г. Зямцоў, 1-я пал. XVIII ст.). Гравюра: творчасць А.Ф. Зубава (1682–1751) – “Панарама Пецярбурга” (1716–1717) і інш. Станаўленне жанру партрэта: І.Н. Нікіцін (каля 1690–1741) – партрэт Пятра І (1721), “Напольны гетман” (1720-я), А.М. Матвееў (1701–1739) – аўтапартрэт з жонкай (1729).

**Рускі партрэтны жывапіс сярэдзіны XVIII ст.** І.Я. Вішнякоў (1699 – пасля 1761) – партрэт Сары Фермор (1745), А.А. Антропаў (1716–1795) – партрэт А.М. Ізмайлавай (1754), парадны партрэт Пятра III (1762), І.П. Аргуноў (1727–1802) – партрэт невядомай сялянкі ў рускім касцюме (1784).

**Архітэктура і скульптура Расіі другой паловы XVIII ст.** Творчасць архітэктара В.В. Растрэллі (1700–1771): Екацярынінскі палац у Царскім сяле (1752–1756), Зімні палац у С.-Пецярбургу (1754–1762). Скульптура: творчасць Ф.І. Шубіна (171740–1805) – партрэты А.М. Галіцына (1775), Паўла І (1790-я).

**Жывапіс Расіі другой паловы XVIII ст.** Росквіт партрэтнага жанра. Творчасць Ф.С. Рокатава (1735/36–1808): партрэты Н.Я. і А.П. Струйскіх (абодва – 1772). Творчасць Д.Г. Лявіцкага (1735–1822): партрэт архітэктара А.Ф. Какорынава (1769–1770), партрэт П.А. Дзямідава (1773), партрэты “смалянак” (выхаванак Смольнага інстытута). Творчасць В.Л. Баравікоўскага (1757–1825): партрэт М.І. Лапухіной (1797). Гістарычны жанр у рускім жывапісе: творчасць А.П. Ласенкі (1737–1773) – “Уладзімір і Рагнеда” (1770), “Развітанне Гектара з Андрамахай” (1773).

## Мастацтва Заходняй Еўропы і Расіі першай паловы XIX стагоддзя.

**Мастацтва Францыі.** Рамантычнае ўспрыманне чалавека, ідэя самабытнай індывідуальнасці як галоўная тэма творчасці мастакоў-рамантыкаў. Творчасць Т. Жэрыко (1791–1824): “Паранены кірасір” (1814), “Плыт “Мядузы” (1819). Творчасць Э. Дэлакруа (1798–1863): “Разня на Хіосе” (1824), “Свабода, якая вядзе народ” (1830).

**Росквіт рэалістычнага мастацтва ў Францыі сярэдзіны XIX ст.** Развіццё французскага пейзажа: творчасць К. Каро (1796–1875) – “Раніца ў Венецыі” (каля 1834), “Звонніца ў Аржантэі” (1850-я). Барбізонская школа пейзажа: творчасць Т. Руссо (1812–1862) – “Краявід у аколіцах Гранвіля” (1833). Творчасць А. Дам’е (1808—1879): сатырычныя карыкатуры (серыя “Дзеячы правасуддзя”, 1845–1849), літаграфія “Вуліца Транснанэн” (1834) – водгук на рабочае паўстанне. Замалёўкі гарадскога жыцця ў жывапісе Дам’е: “Прачкі” (каля 1860). Творчасць Ж.–Ф. Мілле (1814–1875): тэма сялянскай працы – “Сейбіт” (1849–1850), “Зборшчыцы каласкоў” (1857). Творчасць Г. Курбэ (1819–1877): “Пахаванне ў Арнане” (1849).

**Мастацтва Расіі: архтэктура і скульптура першай паловы XIX ст.** Класіцызм у архітэктуры і горадабудаўніцтве. Творчасць А.Н. Вараніхіна (1759–1814): Казанскі сабор у С.–Пецярбургу (1800–1811). Творчасць К.І. Россі (1775–1849): Міхайлаўскі палац (1819–1825, цяпер будынак Дзяржаўнага Рускага музея). Росквіт рускай класіцыстычнай скулыпуры. Творчасць

І.П. Мартаса (1754–1835): помнік Мініну і Пажарскаму ў Маскве (1804–1818).

**Рускі жывапіс першай паловы XIX ст.** Творчасць А.А. Кіпрэнскага (1782–1836): партрэт гусара Я. Давыдава (1809), партрэт А.С. Пушкіна (1827). Партрэтыст В.А. Трапінін (1776–1857): партрэты А.С. Пушкіна (1827), вобразы людзей з народа – "Пляцельшчыца карункаў" (1823). Жанравыя карціны і партрэты П.А. Фядотава (1815–1852): "Свежы кавалер" (1846), "Сватанне маёра" (1848). Творчасць К.П. Брулова (1799–1852): "Апошні дзень Пампеі" (1830–1833). Творчасць А.А. Іванава (1806–1858): "З'яўленне Хрыста перад народам" (1837–1857).

## <u>Мастацтва Заходняй Еўропы і Расіі другой паловы XIX стагоддзя.</u>

**Мастацтва Францыі.** Росквіт французскага жывапісу. Творчасць Эдуарда Манэ (1832–1883): "Снеданне на траве" (1863), "Алімпія" (1863), "Бар у Фалі-Бержэр" (1881–1882). **Імпрэсіянізм** – новае бачанне свету, заснаванае на непасрэдным зрокавым уражанні, назіранні прыроды, перадачы колераў і святла як зменлівых элементаў рэальнага свету. Творчасць Клода Манэ (1840–1926): "Уражанне. Усход сонца" (1872), "Бульвар Капуцынак у Парыжы" (1873), серыі карцін "Стагі сена" (1886), "Руанскія саборы" (1893–1895). Творчасць Э. Дэга (1834–1917): "Балерына на сцэне" (1876–1878), "Спявачка з кафэ" (1878). Творчасць А. Рэнуара (1841–1919): партрэт актрысы Жанны Самары (1877), "Дзяўчына з веерам" (каля 1881).

**Постімпрэсіянізм**. Пластычная матэрыяльнасць жывапісу П. Сезанна (1839–1906): "Ігракі ў карты" (1890–1892), нацюрморты – "Персікі і грушы" (1888–1890) і інш., краявіды гары Сен-Віктуар. Пошукі жывапіснай выразнасці ў творчасці П. Гагена (1848–1903): "Жоўты Хрыстос" (1889). Ад'езд Гагена на востраў Таіці, "таіцянскія пастаралі" (1891–1903). Драматызм, экспрэсіўны характар твораў В. Ван Гога (1853–1890): "Ядакі бульбы" (1885), "Начное кафэ ў Арле" (1888), "Аўтапартрэт з перавязаным вухам" (1889) і інш.

**Мастацтва Расіі.** Дэмакратычны напрамак у мастацтве. Дзейнасць "*Товарищества передвижных художественных выставок*" (заснавана ў 1870). Творчасць В.Г. Пярова (1834–1882): "Провады нябожчыка" (1865), "Тройка" (1866), партрэт Ф.М. Дастаеўскага (1872). Творчасць І.М. Крамскога (1837–1887): "Хрыстос у пустыні" (1872), "Незнаёмая" (1883).

Творчасць І.Я. Рэпіна (1844–1930): тэма народнага жыцця – "Бурлакі на Волзе" (1870–1873), тэма рэвалюцыйнай барацьбы – "Не чакалі" (1884), тэма расійскай гісторыі – "Іван Жахлівы і яго сын Іван" (1885), партрэты Рэпіна: партрэт М.П. Мусаргскага (1881), "Урачыстае пасяджэнне Дзяржаўнага Савета" (1901–1903). Гістарычны жывапіс В.І. Сурыкава (1848–1916): "Раніца стралецкай кары" (1881), "Баярыня Марозава" (1887).

Пейзажны жывапіс "*передвижников*"**.** Лірычныя пейзажы А.К. Саўрасава (1830–1897) – "Гракі прыляцелі" (1871). Эпічнае ўспрыманне прыроды ў творах І.І. Шышкіна (1832–1898): "Жыта" (1878), "Сосны, асветленыя сонцам" (1886). Лірычныя пейзажы І.І. Левітана (1861–1900): "Над вечным спакоем" (1894).

**Рускае мастацтва мяжы XIX і XX стагоддзяў.** Творчасць В.А. Сярова

(1865–1911): “Дзяўчынка з персікамі” (1887), партрэты М.А. Марозава (1902), М.Н. Ярмолавай (1905). Творчасць М.А. Врубеля (1856–1910): “Дэман” (1890), “Пан” (1899), “Царэўна-лебедзь” (1900), партрэт Н.А. Забэлы-Врубель (1904).

## 3. СУБЯСЕДВАННЕ ПА ПЫТАННЯХ СУЧАСНАГА МАСТАЦТВА, МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА І МАСТАЦКАЙ КРЫТЫКІ (ВУСНА)

Субяседванне па пытаннях сучаснага мастацтва, мастацтвазнаўства і мастацкай крытыкі (вусны калёквіум) – апошні этап творчага экзамену, які праводзіцца з мэтай выявіць схільнасць абітурыентаў да прафесіі мастацкага крытыка і мастацтвазнаўцы, шырыню іх эрудыцыі, уменне самастойна і лагічна мысліць, творча вырашаць пастаўленыя задачы.

Экзаменацыйнае заданне калёквіума складаецца з пытання і задання. Пры адказе на пастаўленае тэарэтычнае або практычнае **пытанне** трэба прывесці канкрэтныя прыклады, падмацаваць свае вывады фактамі мастацкага жыцця, асабістымі ўражаннямі ад прачытаных кніг і артыкулаў, расказаць аб наведаных музеях і мастацкіх выстаўках.

**Тэматыка субяседвання (калёквіума)**

**Віды мастацтва. Жывапіс:** тэхнікі жывапісу (тэмпера, фрэска, мазаіка, вітраж, алейны жывапіс). Паняцце аб манументальным і станковым жывапісе. Выяўленчыя сродкі жывапісу: колер і святло, кампазіцыя, прастора ў жывапісе (перспектыва). **Скульптура:** матэрыялы і тэхнікі. Паняцце аб круглай скульптуры і рэльефе. Роля колеру ў скульптуры. Паняцце манументальнай скульптуры, характар узаемасувязей скульптуры і архітэктуры. Мемарыяльныя комплексы Беларусі, прысвечаныя подзвігу народа ў Вялікай Айчыннай вайне. **Арыгінальная графіка:** малюнак алоўкам, тушшу; пастэль, акварэль. Стылістычная і вобразная самабытнасць твораў арыгінальнай графікі. **Друкаваная графіка (гравюра):** асноўныя тэхнікі (дрэварыт, медзярыт, афорт, лінагравюра і інш.). Мастацкае выяўленне тэхнічных магчымасцей гравюры. Мастацкая спецыфіка плаката. Мастацтва афармлення кніг. **Архітэктура:** мова архітэктурных форм і асаблівасці мастацкага вобраза ў архітэктуры. Праблема ансамбля ў архітэктуры. Архітэктурнае асяроддзе гарадоў Беларусі. **Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва:** асноўныя разнавіднасці (мастацкая кераміка, шкло, метал, мастацкая апрацоўка дрэва, тэкстыль). Стыль і мода ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве.

**Жанры мастацтва. Жанр** як гістарычна выпрацаваная сістэма сюжэтна-тэматычных форм мастацтва. Параўнальная характарыстыка жанравай структуры розных відаў мастацтва – жывапісу, графікі, скульптуры. **Партрэт** – адлюстраванне асобы чалавека ў комплексе асаблівасцей знешнасці і ўнутраных псіхалагічных характарыстык. Унутрыжанравая дыферэнцыяцыя партрэта (парадны, камерны, жанравы, партрэт-карціна і інш.). **Гістарычны жанр** – адлюстраванне падзей, якія маюць грамадскую і ідэйную значнасць. Крыніцы сюжэтаў гістарычнага жанра: гісторыя і сучаснасць, міфалогія і літаратура. Рэлігійныя сюжэты ў мастацтве. Паняцце батальнага жанра.

**Бытавы жанр** (жанравая карціна). Гісторыя станаўлення бытавога жанра ў еўрапейскім мастацтве. Роля бытавога жанра ў працэсе дэмакратызацыі мастацтва. **Пейзаж** – адлюстраванне прыроды і створанай чалавекам архітэктурнай прасторы. Магчымасці пейзажнага жанра ў перадачы эмоцый, пачуццяў і думак чалавека. **Нацюрморт** – адлюстраванне света рэчаў. Вырашэнне пластычных, дэкаратыўных і сімвалічных задач у нацюрморце, яго сэнсавы падтэкст.

**<u>Музейныя калекцыі твораў мастацтва.</u>** **Асноўныя віды музеяў:** карцінная галерэя, дом-музей, музей-запаведнік, архітэктурна-паркавы ансамбль, краязнаўчы музей. Формы музейнай работы: рэстаўрацыя і захаванне, вывучэнне і папулярызацыя мастацтва, экскурсійна-адукацыйная дзейнасць. **Найбуйнейшыя музеі свету:** Лувр (Францыя), Прадо (Іспанія), Галерэя Уфіццы (Італія), Брытанскі музей і Нацыянальная галерэя (Вялікабрытанія), Дрэздэнская галерэя і Старая Пінакатэка (Германія), Музей Метраполітэн (ЗША) і інш. **Найбуйнейшыя музеі Расіі:** Дзяржаўны Эрмітаж, Дзяржаўная Траццякоўская галерэя. **Найбуйнейшыя музейныя калекцыі Беларусі:** Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны гістарычны музей рэспублікі Беларусь і інш.

**<u>Паняцце аб мастацкім жыцці краіны (рэгёна, горада)</u>. Выставачная дзейнасць:** калектыўныя і персанальныя выстаўкі. Тэматыка і канцэпцыя выстаўкі. Роля мастацтвазнаўцы-куратара ў арганізацыі выстаўкі. **Выставачнае жыццё сучаснай Беларусі:** найбуйнейшыя выставачныя залы – Рэспубліканская мастацкая галерэя Беларускага саюза мастакоў (Палац мастацтва), Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь, іншыя выставачныя цэнтры і галерэі Мінска і буйных гарадоў краіны. Самыя значныя выставачныя праекты апошніх гадоў. **Мастацкая адукацыя.** Роля мастацкіх вучылішчаў і УВА ў падрыхтоўцы маладых мастакоў. Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў. **Перыядычны друк і мастацтва.** Спецыялізаваныя перыядычныя выданні, прысвечаныя пытанням мастацтва і культуры: часопіс “Мастацтва”, газеты “Культура” і “ЛіМ”.

**<u>Уяўленне аб прафесіі мастацтвазнаўцы і мастацкага крытыка.</u>** **Асноўныя формы літаратуры аб мастацтве:** манаграфія, артыкул, каталог, альбом, падручнік. Найбольш папулярныя кнігі аб мастацтве Беларусі для дзяцей і моладзі. **Задачы навуковага вывучэння мастацтва:** выяўленне гістарычных заканамернасцей яго развіцця, захаванне мастацкай спадчыны народа, выхаванне сродкамі мастацтва. **Даследчыкі і крытыкі беларускага выяўленчага мастацтва.** Працы **М.М. Шчакаціхіна** (1896–1940): “Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва” (1928). Працы **Л.Н. Дробава** (1926–2002): “Жывапіс Беларусі XIX – пачатку XX ст.” (1974), “Жывапіс Савецкай Беларусі (1917–1975 гг.)” (1979) і інш. Працы **М.Ф. Раманюка** (1944–1997): “Беларускае народнае адзенне” (1981) і інш. Працы **В.Ф. Шматава** (нар. 1936): “Сучасная беларуская графіка” (1979), “Беларуская станковая графіка” (1978), “Мастацтва кнігі Францыска Скарыны” (1990). Працы **Н.Ф. Высоцкай** (нар. 1943):

“Жывапіс Беларусі XIII–XVIII стст.” (1980), “Пластыка Беларусі XIII–XVIII стст.” (1983) і інш. Працы **Я.М. Сахуты** (нар. 1945): “Народнае мастацтва Беларусі: традыцыі і сучаснасць”(1982) і інш. **В.І. Жука** (нар. 1958) “Живопись Беларуси на рубеже веков: потери и обретения” (2013).

## Мастацтва Беларусі XX ст.

Мастацтва Беларусі 1–ай паловы XX ст.

**Архітэктура:** гістарычныя стылізацыі ў архітэктуры пачатку XX ст.: “нэарускі стыль” – Царкоўна-археалагічны музей у Мінску (В. Струеў, 1913); “нэараманскі стыль” – касцёл Сымона і Алены ў Мінску (Т. Пайздэрскі, У. Марконі, Г. Гай, 1906–1910); нэагатычны рысы ў архітэктуры: Траецкі касцёл у в. Гервяты (1903). Уплывы стылю “мадэрн”: банк у Слоніме (1905) і інш.

**Жывапіс 1900–1910-х гг.** Росквіт пейзажнага жанру. Творчасць Ф. Рушчыца (1870–1936): “Зямля” (1898), “У касцёла” (1899). Творчасць С. Жукоўскага (1875–1944): “Восень у сядзібе” (1906), “Мінуўшчына” (1912). Творчасць У. Бялыніцкага-Бірулі (1872–1957): “Сакавіцкія прыцемкі” (1903), “Зімовы пейзаж” (1912), “Блакітная капліца” (1920). Развіццё бытавога жанру. Творчасць Ю. Пэна (1854–1937): “Стары кравец” (1902), “Майстар гадзіннікаў” (1914). Мастацкая школа Пэна ў Віцебску і яго вучні.

**Мастацкая жыццё Беларусі 1920-х гадоў.** Віцебская мастацкая школа (1918–1923). Дзейнасць М. Шагала (1889–1985). К. Малевіч (1878–1935) – заснавальнік і кіраўнік мастацкага аб'яднання УНОВИС (1920–1922).

**Жывапіс и графіка Беларусі 1920-х гг.** Творчасць М. Філіповіча (1896–1947): “Жанчына ў наміткі” (1928), “На Купалле” (1920-я), “Бітва на Нямізе” (1922). Творчасць А. Тычыны (1897–1986).

**Станковая скульптура 1920-х гг.** Творчасць А. Грубэ (1894–1980): “Лірнік” (1925), “Раб” (1928). Творчасць А. Бразера (1982–1942).

**Мастацтва Беларусі 1930-х гг.** Узвядзенне значных грамадскіх будынкаў. Рысы канструктывізму ў архітэктуры 1930-х. Творчасць архітэктара І. Лангбарда (1882–1951): Дом Урада (1930–1934), Акадэмія навук БССР (1934–1939), Дом Чырвонай Арміі (1934–1939), тэатр оперы і балета (1934–1938). Творчасць І.В. Ахрэмчыка (1903–1971). Творчасць А. Бембеля (1905–1986): рэльефы для Дома Урада ў Мінску (1932–1934), “М. Гастэла” (1943) і інш. Партрэты З. Азгура (1908–1995).

**Выяўленчае мастацтва Заходняй Беларусі.** Графіка і жывапіс Я. Драздовіча (1888–1954): гістарычныя і фантастычныя творы Я. Драздовіча: “Усяслаў Полацкі” (1923), “Сустрэча вясны на Сатурне” (1932), цыкл “Жыццё на Месяцы” (1932–1933), размаляваныя дываны Я. Драздовіча (“маляванка”), іх адрозненне ад традыцыйных народных “маляванок”. Творчасць М. Сеўрука (1905–1979): “Жніво” (1937).

Мастацтва Беларусі 2–ой паловы ХХ ст.

“**Гераічны рэалізм”** мастацтва пасляваеннага дзесяцігоддзя. Жывапіс, станковая графіка. У. Сухаверхаў (1908–1977) “За родную Беларусь” (1948 г.), І. Ахрэмчык (1903–1971).

**“Суровы стыль”** у беларускім мастацтве 1960–х гг. Новыя тэндэнцыі ў жывапісе: Г. Вашчанка (1928–2014), М. Савіцкі (1922–2010), М. Данцыг (1930–2017), Л. Шчамялёў (1923–2021).

**Мастацтва 1970-х гг.** пошук гістарычнай асновы, пераасэнсаванне нацыянальных традыцый у беларускім выяўленчым мастацтве. Жывапіс. Скульптура. Графіка. **Пейзажны жывапіс:** творчасць В. Цвіркі (1913–1993), П. Масленнікава (1914–1995) і інш. Нацыянальная мастацкая школа **графікі.** Творчасць В. Шаранговіча (нар. 1939), А. Кашкурэвіча (1929–2013) і інш. Дасягненні беларускага **манументальна-дэкаратыўнага мастацтва**. Творчасць А. Кішчанкі (1933–1997), У. Стальмашонка (1928–2013), Г. Вашчанкі (1928–2014) і інш.

Удзел беларускіх мастакоў і архітэктараў у стварэнні мемарыяльных комплексаў, прысвечаных барацьбе беларускага народу супраць фашызма. Комплекс у в. Хатынь (архітэктары Л. Левін, Ю. Градаў, В. Занковіч. Скульптар С. Селіханаў).

**Выяўленчае мастацтва 1980-х гг.** Тэма нацыянальнага адраджэння ў беларускім жывапісе, скульптуры, графіцы 1980–х гг. Чарнобыльская катастрофа ў беларускім выяўленчым мастацтве і мастацкай фатаграфіі. У. Кожух (нар. 1953), В. Шкаруба (1957–2020), Ул. Зінкевіч (нар. 1951).

. **Скульптура 1980-х. гг.** Станковыя і манументальныя творы У. Слабодчыкава (нар. 1952), В. Янушкевіча (нар. 1962).

**Станковая і кніжная графіка 1980-х гг**. У. Савіч (нар. 1952), В. Славук (нар. 1947), М. Селяшчук і інш.

**Беларускі плакат 1980–1990-х** гг. Работы У. Цэслера (нар. 1951), С. Войчанка (1954–2004) і інш.

**Мастацтва Беларусі другой паловы 1990-х – пачатку 2000-х гг**. Мастацкія акцыі, жывапіс (І.Бархаткоў (нар.1958), М. Ісаёнак (нар. 1949), А.Бараноўскі (1937–2017), У.Тоўсцік (нар. 1949), А.Шлегель (нар. 1965), З.Літвінава (нар. 1938), М.Бушчык (нар. 1948) і інш.), В. Губараў (нар. 1948),, графіка (П.Татарнікаў (нар. 1971) , Ю.Хілько (нар. 1960) і інш.), Ю. Якавенка (нар. 1965), скульптура (К.Костюченко (нар.1980), С.Оганов (нар. 1974) і інш.).

## <u>Выяўленчае мастацтва Беларусі пачатку XXI стагоддзя</u>

Пераасэнсаванне поспехаў мінулага стагоддзя. Творчасць мастакоў, актыўная творчая праца якіх пачалася ў 1990-я гады. Новыя тэмы ў творчасці мастакоў. Разнастайнасць мастацкіх пошукаў ў відэаарту, перфомансу, камп’ютарнай графіцы. Прэзентацыя творчасці беларускіх мастакоў у прасторы Internet. Узаемаўплывы відаў мастацтва і графічнага дызайну, фотаграфікі. Шырокае выкарыстанне калажу, змешаных тэхнік, магчымасцяў камп’ютарнай графікі.

Манументальнае мастацтва пачатку 2000-х гг. (мастацкае афармленне Нацыянальнай бібліятэкі РБ, станцый Мінскага метрапалітэна і інш.). Мемарыяльны комплекс “Трасцянец” (2015). Скульптура ў сучаснай гарадской прасторы.

# РЭКАМЕНДУЕМАЯ ЛІТАРАТУРА


**Асноўная літаратура:**

1. Анализ и интерпретация произведения искусства : учеб. пособие / под ред. Н. А. Яковлевой. – М. : Высшая школа, 2005. – 529 с.
2. Баразна, М. Р. Выяўленчае мастацтва Беларусі XX стагоддзя / М. Р. Баразна. – Мінск : Беларусь, 2017. – 293 с.
3. Бирюкова, Н. В. История архитектуры : учеб. пособие [для средних специальных учебных заведений по специальности 2901 "Архитектура"] / Н. В. Бирюкова. – М. : ИНФРА-М, 2005. – 366 с.
4. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т / гал. рэд. С. В. Марцэлеў [і інш.]. – Мінск Навука і тэхніка, 1987–1994. – 6 т.
5. Гомбрих, Э. История искусства : пер. с англ. / Э. Гомбрих. – М. : АСТ, 1998. – 688 с.
6. Ильина, Т. В. История искусства : Западноевропейское искусство : учебник / Т. В. Ильина; ред. С. А. Юшина. – 3-е изд., перераб. и доп. – М. : Высш. шк., 2000. – 368 с.
7. Ильина, Т. В. История искусств : отечественное искусство : учебник / Т. В. Ильина. – 3-е изд., перераб и доп. – М. : Высш. шк., 2003. – 407 с.
8. Лазука, Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва : у 2 т. / Б. А. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2007. – 2 т.
9. Лазука, Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. Рускае і беларускае мастацтва XIX– пачатку XX стагоддзя / Б. А. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2011. – 431 с.
10. Любимов, Л. Д. Искусство Западной Европы / Л. Д. Любимов. – М. : АСТ: Астрель, 2005. – 240 с.
11. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: ў 5 тамах / гал. рэд. Шамякін [і інш.]. – Мінск : Бел. Сав. энцыкл., 1984– 1987. – 5 т.

**Перыядычныя выданні:** часопіс «Мастацтва», газеты «Культура», «ЛіМ».

**Дадатковая літаратура:**

**I. Мастацтва Беларусі**

1. Архітэктура Беларусі : нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславян. і еўрап. Кантэксце : у 4 т. / навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск : Беларуская навука, 2006–2009. – 4 т.
2. Баразна, М. Р. Беларуская кніжная графіка 1960–1990-х гадоў / М. Р. Баразна. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2001. – 207 с.
3. Баразна, М. Р. Гісторыя выяўленчага мастацтва Беларусі XX ст. / М. Р. Баразна. – Мінск : БГАИ, 2016. – 320 с.
4. Баразна, М. Р. Кніжная графіка Беларусі XX стагоддзя : вучэб. дапаможнік / М. Р. Баразна. – Мінск : БДАМ, 2017. – 144 с.

5. Баразна, М. Р. Мастацтва кнігі Беларусі XX стагоддзя / М. Р. Баразна. – Мінск : Беларусь, 2007. – 239 с.
6. Борозна, М. Г. Белорусская живопись 1920–1970-х годов : вучэб. дапаможнік / М. Г. Борозна. – Мінск : БГАИ, 2006. – 191 с.
7. Беларускі саюз мастакоў 1938-1998 гг. : энцыклапедычны даведнік / рэдкал. : Г. В. Буралкін [ і інш. ] ; гал. рэд. Б. А. Крэпак. – Мінск : Кавалер Паблішэрс, 1998. – 662 с.
8. Вытокі творчасці. Беларуская акадэмія мастацтваў : альбом / рэдкал. : В. П. Шаранговіч (старш.), А. А. Каляда, А. П. Азончык [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1995. – 263 с.
9. Габрусь, Т. Саборы помняць усё. Готыка і рэнесанс у сакральным дойлідстве / Т. Габрусь. – Мінск : Беларусь, 2007. – 167 с.
10. Габрусь, Т. В. Мураваныя харалы. Сакральная архітэктура беларускага барока / Т. В. Габрусь. – Мінск : Ураджай, 2001. – 287 с.
11. Дробов, Л. Н. Живопись Белоруссии XIX–начала XX в. / Л. Н. Дробов. – Мінск : Вышэйш. школа, 1974 – 240 с.
12. Жук, В. И. Живопись Беларуси на рубеже веков : потери и обретения / В. И. Жук. – Минск : Белорусская наука, 2013. – 319 с.
13. Іканапіс Беларусі XVI-XVIII стагоддзяў / аўт. і склад. Н. Ф. Высоцкая. – Мінск : Беларусь, 1992. – 230 с.
14. Краіна Беларусь : ілюстраваная гісторыя / тэкст У. Арлоў ; маст. З. Герасімовіч. – Martin : Neografia, 2003. – 317 с.
15. Кулагин, А. Н. Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии : вторая половина XVIII–начало XIX в. / А. Н. Кулагин. – Минск : Навука і тэхніка, 1981. – 134 с.
16. Лазука, Б. А. Слоўнік тэрмінаў : архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна–прыкладное мастацтва / Б. А. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2001. – 156 с.
17. Лявонава, А. К. Старажытнабеларуская скульптура / А. К. Лявонава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 208 с.
18. Алексеев, А. А. Наследие Беларуси = Aliakseyeu, A., Lukashevich, O. Heritage of Belarus / А. А. Алексеев, О. В. Лукашевич. – Минск : МФЦП, 2007. – 317 с.
19. Нікалаеў, М. В. Палата кнігапісная : Рукапісная кніга на Беларусі ў X–XVIII стагоддзях / М. В. Нікалаеў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1993. – 239 с.
20. Нікалаеў, М. В. Гісторыя беларускай кнігі : у 2 т. / пад. агульн. рэд. М. В. Нікалаева. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009–2011. – 2 т.
21. Петэрсон, Э. А. Портретная скульптура Советской Белоруссии / Э. А.Петэрсон. – Минск : Вышэйшая школа, 1982. – 109 с.
22. Пластыка Беларусі XII–XVIII стагоддзяў : альбом / аўт.-склад. Н. Ф. Высоцкая. – Мінск : Беларусь, 1983. – 230 с.
23. Раманюк, М. Ф. Беларускае народнае адзенне / М. Ф. Раманюк– Мінск : Беларусь, 1981. – 473 с.
24. Сакральная живопись Беларуси XV–XVIII веков = Сакральны жывапіс

Беларусі XV–XVIII стагоддзяў = The painting sacred of Belarus XV–XVIII centures : репродукции / сост. Н. Ф. Высоцкая ; ред. Т. В. Габрусь [и др.]. – Мінск : Беларусь, 2007. – 218 с.

25. Сахута, Я. М. Народнае мастацтва Беларусі / Я. М. Сахута. – Мінск : БелЭн, 1997. – 287 с.

26. Селицкий, А. А. Живопись Полоцкой земли XI–XII вв. / А. А.Селицкий – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 174 с.

27. Церашчатава, В. В. Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI–XVIII ст. / В. В. Церашчатава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986. – 183 с.

28. Хадыка, А. Непаўторныя рысы : з гісторыі беларускага партрэта / А. Хадыка, Ю. Хадыка.– Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 143 с.

29. Чантурия, В. А. История архитектуры Белоруссии : в 2 т. / В. А. Чантурыя. – Минск, 1985.

30. Шматаў, В. Ф. Мастацтва беларускіх старадрукаў (XVI—XVIII стст.). – Мінск : Тэхналогія, 2000. – 131 с.

**II. Мастацтва Заходняй Еўропы.**

1. Алпатов, М. В. Художественные проблемы итальянского Возрождения / М. В. Алпатов. – М. : Искусство, 1978. – 234 с.

2. Арган, Дж. К. История итальянского искусства. / Дж. К. Арган. – М. : Высш.шк., 2000. – 368 с.

3. Базен, Ж. Барокко и рококо / Ж. Базен. – М. : Слово, 2001. – 288 с.

4. Баткин, Л. М. Леонардо да Винчи и особенности ренессансного творческого мышления / Л. М. Баткин. – М. : Искусство, 1990. – 415 с.

5. Даниэль, С. М. Европейский классицизм / С. М. Даниэль – СПб : Азбука-классика, 2003. – 300 с.

6. Искусство Возрождения в Нидерландах, Франции, Англии / Т. С. Воронина, Н. Л. Мальцева, В. В. Стародубова. – М. : Искусство, 1994. – 144 с.

7. Искусство Средних Веков и Возрождения : энциклопедия / авт.-сост. О. Б. Краснова. – М. : Олма-пресс, 2001. – 302 с.

8. Калитина, Н. Н. Французское изобразительное искусство конца XVIII–XX веков / Н. Н. Калитина. – Л. : Изд-во ЛГУ, 1990. – 274 с.

9. Кастриа Маркетти, Ф. Живопись Ренессанса : открытие мира и человека / Ф. Кастриа Маркетти. – М. : АСТ, 2002. – 399 с.

10. Классицизм и романтизм : Архитектура. Скульптура. Живопись. Рисунок : 1750–1848 / ред. : Р. Томан ; пер. на рус. яз. Н. Панкратова. – Кёльн : ОГИЗ, АСТ, ИЗДАТЕЛЬСТВО, Konemann UK Ltd, 2001. – 520 с.

11. Лазарев, В. Н. Старые европейские мастера / В. Н. Лазарев. – М. : Искусство, 1974. – 360 с.

12. Никулин, Н. Н. Золотой век нидерландской живописи / Н. Н. Никулин.– М. : Изобразит. Иск-во, 1981. – 400 с.

13. Прокофьев, В. Н. Постимпрессионизм / В. Н. Прокофьев. – М. : Искусство, 1973. – 72 с.

14. Раздольская, В. И. Европейское искусство XIX в. / В. И. Раздольская. – СПб : Азбука-классика, 2005. – 384 с.
15. Ревалд, Д. Постимпрессионизм : от Ван Гога до Гогена / Д. Ревалд. – М. : Республика, 2002. – 301 с.
16. Сарабьянов, Д. Стиль модерн. История, истоки, проблемы / Д. Сарабьянов. – М. : Искусство, 1989. – 294 с.
17. Стерноу, С. А. Арт Деко / С. А. Стерноу. – Минск : БЕЛФАКС, 1997. – 128 с.

**III. Мастацтва Расіі.**

1. Бенуа, А. Н. Русское искусство XVIII—XX вв. / А. Н. Бенуа. – М. : Яуза: Эксмо, 2004. – 542 с.
2. Ильина, Т. В. Русский XVIII век. Изобразительное искусство. Музыка / Т. В. Ильина, М. Н. Щербакова. – М. : Дрофа, 2004. – 512 с.
3. Поспелов, Г. Г. Русское искусство начала XX в. Судьба и облик России / Г. Г. Поспелов. – М. : Наука, 1999. – 128 с.
4. Борисова, Е. А. Русский модерн / Е. А. Борисова, Г. Ю. Стернин. – М. : Советский художник, 1997. – 359 с.
5. Гайдамак, А. Русский ампир : архитектура, декоративно-прикладное искусство и убранство интерьера первой терти XIX в. / А. Гайдамак. – Париж : Трилистник, 2000. – 273 с.
6. Виппер, Б. Р. Архитектура русского барокко / Б. Р. Виппер. – М. : Наука, 1978. – 231 с.
7. Молева, Н. М. Живописных дел мастера. Канцелярия от строений и русская живопись первой половины XVIII в. / Н. М. Молева, Э. М. Белютин. – М. : Искусство, 1965. – 336 с.
8. Ракова, М. М. Русское искусство первой половины XIX в. : очерки теории и истории искусства / М. М. Ракова – М. : Искусство, 1975. – 244 с.
9. Сарабьянов, Д. История русского искусства конца XIX–начала XX в. / Д. Сарабьянов. – СПб : Галарт, 2001. – 304 с.
10. Федоров-Давыдов, А. Русский пейзаж конца XIX–начала XX в. / А. Федоров-Давыдов – М. : Искусство, 1974. – 208 с.